# Беларускія народныя скорагаворкі як сродак развіцця мовы

Сычова І.С., кандыдат педагагічных навук, дацэнт

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ЭПІГРАФ

- І тут гу-гу, і там гу-гу, і нічога разабраць не магу.
- Які розум - такая і гаворка.
- Ні снапка звязаць - рассыпаецца, ні слоўца сказаць - заікаецца.

*З беларускага фальклору*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ







РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ПЕДАГАГІЧНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ СКОРАГАВОРАК

- **Павышаюць культуру маўлення**, развіваюць дыкцыю, артыкуляцыю, расшыраюць дыяпазон голасу, фарміруюць правільнае дыханне.
- **Дэманструюць адметнасці фанетычнага і лексічнага складу роднай мовы.**
- **Развіваюць фанематычны слых,** вучаць успрыманню і вымаўленню гукаў, спецыфічных для беларускай мовы: [дж], [дз'], [ц'], [г'] і інш.
- **Актывізуюць інтэлектуальныя і творчыя магчымасці**, вучаць адчуваць народны гумар, гульню слоў, рытмічнасць, сугучнасць, рыфму.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Педагагічныя асаблівасці скорагаворак

- **Лёгка запамінаюцца,** трэніруюць памяць, маюць дасканалую форму, лаканічныя, займальныя.
- **Узбагачаюць слоўнікавы запас**, знаёмяць сучаснага чалавека з рэаліямі традыцыйнай беларускай культуры і побыту.
- **Павучаюць, выхоўваюць:** утрымліваюць маральна-выхаўчы змест, жыццёвыя назіранні  і павучанні.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ФОРМЫ РАБОТЫ СА СКОРАГАВОРКАМІ

- **Фанетычныя практыкаванні**, фанетычная зарадка.
- **Чытанне скорагаворак** (павольнае, хуткае, хорам), тлумачэнне слоў.
- **Чытанне скорагаворак з рознай інтанацыяй:** весела, бадзера, сумна, са здзіўленнем, з раздражненнем і г.д.
- **Вымаўленне, прагаворванне, развучванне скорагаворак** (павольнае, хуткае, хорам).
- **Гутаркі па змесце скорагаворак**, падбор по пэўнай тэматыцы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ФОРМЫ РАБОТЫ СА СКОРАГАВОРКАМІ

- **Аднаўленне, “збіранне” скорагаворак** (з прапушчанымі літарамі, словамі, пераблытанымі часткамі).
- **Рэдагаванне скорагаворак** (замена слоў, або частак скорагаворкі на іншыя).
- **Складанне ўласных скорагаворак** (па тэмах, на пэўны гук).
- **Конкурсы знаўцаў скорагаворак** («Хуткі на язык»).
- **Малюнкі да скорагаворак.**
- **Паказ скарагаворак з дапамогай мімікі і рухаў** («Кракадзіл»).
- **Параўнанне скорагаворак на розных мовах,** выяўленне агульнага і адметнага ў іх фанетычным складзе.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ПОДБОР СКОРАГАВОРАК ПА ГУКАХ

- **Гэй, малы, скажы малому,**
  **Хай малы малому скажа,**
  **Хай малы каня прывяжа** [м,л].
- **Драч з драчыхаю анучы дзецям дзярэ** [д, дз].
- **Сем семярэй,**
  **І сёмяра свіней.**
  **Свінка і свінчын брат**
  **І сямёра парасят** [с].

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Тэматычны падбор скорагаворак

- Лянок не любіць лянот.
- Санлівага не дабудзішся, лянівага не дашлешся.
- Спрытна кроп палоў Пракоп, лёг пад плотам і захроп.
- Чэсь калоду чэша, Чэся цеста месіць.

Лянота, працавітасць

- Дабёр бабёр, бабраняты - на падбор.
- За дзетак - маткі, за матак - таткі.
- Ішоў Пракоп, ішла Пракопіха і ішлі малыя пракапяняткі.

Сям'я, выхаванне

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ЗРАБІЦЬ МАЛЮНКІ ДА СКОРАГАВОРАК

- Цецеручыха цецеруковым цецеручанятам цеста месіць.

- Мама-мышка сушыла шышкі.

Мышка-малышка мыла лыжкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Літаратура


1. **Выслоўі** / склад., сістэм. тэкстаў, уступ. арт. і камент. М.Я. Грынблата ; рэд. тома А.С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1979. – 520 с.
2. **Залаты клубочак** / укладальнік У.Васілевіч. Мінск: Мастацкая літаратура, 2007 – 93 с.
3. **Мама мышка сушыла шышкі**. Беларускія народныя скорагаворкі. – Мінск: Юнацтва, 1983. – 14 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ